

## СУШКОЎ
## МІКАЛАЙ КАЛІСТРАТАВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Нарадзіўся ў маі 1900 года ў в. Воўкавічы Талачынскага раёна.

У 1919–1920 гг. у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны 1919-1922 гг. З 1924 года працаваў на савецкай, партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Талачынскім раёне Віцебскай вобласці і ў Астравецкім раёне Вілейскай вобласці. Член КПСС з 1930 года.

У 1941 годзе па заданні ЦК перайшоў лінію фронту для арганізацыі партызанскага руху. З 1942 года камісар партызанскага атрада. З 1943 года камісар 8-й Круглянскі партызанскай брыгады "За Радзіму" пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза С.Г. Жуніна. У верасні 1943 – ліпені 1944 гг. – намеснік камандзіра Круглянскай ваенна-аператыўнай групы.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны, медалямі.

З 1944 года на савецкай рабоце ў Круглянскім раёне, на гаспадарчай рабоце ў Шклове і Оршы.

Памёр 22 студзеня 1964 года.

**Крыніцы інфармацыі:**

1. **Мікалай Калістратавіч Сушкоў** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. – С. 646.

2. **Участник Великой Отечественной войны Сушков Николай Калистратович** : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : 1418museum.ru›heroes/459899/

3. **Сушков Николай Калистратович** // Память народа : Подлинные документы о Второй Мировой войне : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : pamyat-naroda.ru.